# Literaturoznawstwo

UWM Olsztyn Acta Polono-Ruthenica XXIII/4, 2018
ISSN 1427-549X

**Anna Alsztyniuk**
Uniwersytet w Białymstoku

# Вобраз героя ў аповесцях Андрэя Федарэнкі (на аснове кніг *Ланцуг* і *Ціша*)[1]

Андрэй Федарэнка (год нараджэння 1964) – адзін з тых нешматлікіх пісьменнікаў, якіх яшчэ пры жыцці даследчыкі залічылі ў шэрагі класікаў беларускай літаратуры. Кнігі прозы, сярод якіх *Гісторыя хваробы* (1989, 1990), *Смута* (1994), *Шчарбаты талер* (1999), *Тры талеры* (2000), *Афганская шкатулка* (2002), *Нічые* (2009), зборнік літаратурных эсэ *Сечка* (2013), сведчаць аб шырокім творчым патэнцыяле пісьменніка. На шматгранны дыяпазон выяўлення творчай асобы А. Федарэнкі звяртае ўвагу Лада Алейнік:

> Творчую індывідуальнасць Андрэя Федарэнкі ахарактэрызаваць складана. Калі паспрабаваць скласці «псіхалагічны партрэт» пісьменніка паводле яго твораў, то вобраз атрымаецца надзвычай супярэчлівы. Эпік і лірык, іронік і сатырык, рамантык і рэаліст. Сціплы і амбітны. Надзвычай далікатны, чуйны, датклівы… І выключна жорсткі. Шчыры, як дзіця, і хітраванец, якіх свет не бачыў. Ён шматаблічны і непрадказальны. Бясспрэчна адно: Федарэнка па-сапраўднаму таленавіты [Алейнік, online].

Да разгляду твораў пісьменніка звярталіся многія літаратуразнаўцы (Алесь Бельскі, Ганна Кісліцына, Іван Штэйнер, Ігар Запрудскі, Ігар Шаладонаў, Анжаліка Дубасава і іншыя), аднак феномен творчасці А. Федарэнкі патрабуе далейшага ўдумлівага аналізу. Цікава, што яго проза наватарская і пры тым традыцыйная. З аднаго боку, пісьменнік выкарыстоўвае галоўныя рысы паэтыкі постмадэрну: інтэртэкстуальнасць, аўтатэматызм. З другога – у яго прозе адчуваецца выразнае наследаванне традыцый Кузьмы Чорнага і Максіма Гарэцкага. Абапіраючыся на здабыткі класікаў, пісьменнік плённа развівае айчынную прозу на новым яе этапе:

[1] Publikacja finansowana ze środków Ministra Nauki i Szkolnictwa Wyższego w ramach dotacji na utrzymanie potencjału badawczego przyznanej Wydziałowi Filologicznemu Uniwersytetu w Białymstoku.

> Прыналежнасць прозы А. Федарэнкі да класічных традыцый пацвярджае і манера аўтарскага пісьма – рэалістычнага наратыву, напоўненага псіхалагічнымі рэфлексіямі героя, у якім угадваецца alter ego пісьменніка, і хрэстаматыйны набор вобразаў, якім акрэсліваецца тэматычны дыяпазон найбольш значных яго твораў. Аднак прысутнасць традыцыі ў творах А. Федарэнкі азначае не столькі яе працяг, колькі імкненне аўтара, зыходзячы са свайго вопыту і светабачання, даць уласную ацэнку тым уяўленням, якія здаўна прыжыліся ў беларускай літаратуры. Адштурхоўваючыся ад нацыянальнага літаратурнага канону, проза А. Федарэнкі ўключаецца ў своеасаблівы дыялог з класікай аб сутнасных характарыстыках беларускага быцця [Кошман, online].

Ад самага пачатку творчасці для А. Федарэнкі галоўным аб’ектам мастацкага даследвання стала псіхалогія чалавека. Эстэтычнае крэда пісьменніка бачыцца менавіта ў імкненні шырока паказаць жыццё свайго сучасніка, свет яго перажыванняў, пачуццяў і думак. Гісторыі, прапануемые чытачу пісьменнікам, класічныя: апавядаюць яны найперш аб пошуках шчасця, уласнага месца ў свеце.

Пісьменнік эксперыментуе з рознымі жанрамі, але самае значнае месца ў яго творчасці належыць аповесці. «Я люблю само слова – аповесць, люблю гэтую форму, яна дазваляе сказаць роўна столькі, на колькі хапае майго дыхання, з аднаго боку ўтрымлівае ад шматслоўнасці, з другога – не абмяжоўвае жорсткімі апавядальна-навельнымі рамкамі» [Федарэнка, online], – прызнаўся ў адным з інтэрв’ю А. Федарэнка. Жанр аповесці дазваляе пісьменніку выявіць сутнасць нейкай падзеі, абмаляваць станаўленне характару героя ці некалькі ж дзейных асоб у іх развіцці. Дакладна выказаўся на гэту тэму Уладзімір Навумовіч, адзначыўшы:

> Раскрыць «чалавечае ў чалавеку» можна самымі рознымі сродкамі, але вось паказ самага набалелага, «тэмпературы кіпення страсцей», хвалюючага і нечаканага, вымушае пэўнага адбору эмоцый, накалу пачуццяў, дынамікі разгортвання падзей, адпаведнай формы і ступені падыходу. Такой формай, якая раскрываючы ўзлёт ці падзенне чалавечага духу, трагедыйнасць ці дынаміку прыняцця рашэння ў пэўны момант чалавечага існавання на белым свеце, з’яўляецца аповесць [Навумовіч, online].

А. Федарэнку, мастака слова, цікавіць, як і чаму герой робіць свой выбар, ці парушае пры гэтым маральны закон. Пісьменнік паказвае свайго персанажа ў руху, стварае пэўны ланцужок эпізодаў, дзе кожны новы факт – штрых да выяўлення яго духоўнай сутнасці. Пры тым пісьменнік не спрабуе стварыць абагульнены панарамны партрэт свайго часу, але акцэнтуецца на паказе толькі некаторых фрагментаў рэчаіснасці. Ён стварае цэлую галерэю людскіх тыпаў,

своеасаблівую мазаіку характараў. У дадзеным Марыне Кузьміч інтэрв’ю Сцяпан Лаўшук сцвердзіў, што А. Федарэнка «не стараецца пісаць пра нейкага ўсярэдненага сучасніка. Ён адкрывае ў творах свае праблемы» [Кузьмич, online]. Сам жа А. Федарэнка некалі катэгарычна засведчыў:

> (…) у кожным творы з першых словаў праяўляецца аўтар. Не героі, не сітуацыя, не час, не сюжэт, а менавіта чалавек-аўтар са сваім унутраным светам. І з першых двух сказаў становіцца зразумелым, дзеля чаго ён піша, што ён любіць, ці многа ён любіць, ці дастаткова начытаны ён, – адпаведна, ці варта чытаць яго далей. Так што пытанне павінна ставіцца так: не «ацэнка мастацкіх вартасцяў твора», а ацэнка чалавека, які гэты твор напісаў. «Што ты за чалавек? Што новага, такога, чаго я, чытач, яшчэ не ведаю, ты мне можаш сказаць?» [Федарэнка, online].

Хто ж такі, як пісьменнік, А. Федарэнка? Адказаў на гэтае пытанне, як зазначыла ўжо і ўзгаданая Л. Алейнік, шмат, бо ў кожным са сваіх твораў пісьменнік раскрывае частку самога сябе. Пры тым, у яго творах, адрасаваных даросламу чытачу, можна выдзеліць тры асноўныя тыпы герояў: вясковец, гараджанін, пісьменнік (або рэдактар). Выбар менавіта такіх герояў відавочна абумоўлены біяграфіяй пісьменніка, галоўнымі этапамі яго жыцця: вясковым, мінскім, творчым. А. Федарэнка нарадзіўся ў вёсцы Бярозаўка на Гомельшчыне, але дарослае жыццё звязаў са сталіцай Беларусі. У большасці твораў пісьменніка гучыць як шчырая любоў да Малой Айчыны, яе цудоўных краявідаў і жыхароў, так і расчараванне гарадскім ладам жыцця.

Першую групу герояў федарэнкаўскіх аповесцяў ствараюць гараджане, а менавіта мужчыны, што ў нейкі момант аказаліся на раздарожжы і шукаюць адказу на пытанне: што далей? Часта гэта былыя вяскоўцы, якія маюць патрэбу ў хаця б часовым блізкім кантакце з прыродай. Валодзін (*У Крыме*) ад мінскай мітусні раз у год уцякае ў невялікі пасёлак на беразе Крыма. Адольф (*Дзядзька Адольф*) у выхадныя едзе на прыроду маляваць акварэлькі. Згаданыя героі тонка адчуваюць прыгажосць прыроды, добра яе разумеюць, шануюць. На жаль, у кожнага з герояў – складаныя адносіны з людзьмі. У многім іх думкі, учынкі разыходзяцца з меркаваннямі іншых:

> Герояў Андрэя Федарэнкі мучаць і прыгнятаюць пытанні, якія, кажучы агульна, тычацца грошай, самасвядомасці, кахання. Пісьменнік стварае сітуацыі, якія ненавязліва змушаюць герояў да выбару, што становіцца вызначальным і кардынальна ўплывае на далейшае жыццё. Героі сутыкаюцца з праблемамі, якія, відавочна, хвалююць аўтара, і спрабуюць спасцігнуць іх сэнс. Ствараецца ўражанне, што і аўтар, і героі спавядаюцца, аналізуюць кожную драбніцу, свой псіхалагічны стан, свае адчуванні [Кісліцына 2012, 91].

Адольф, пазнаёміўшыся ў санаторыі з Тамарай, пачынае весці камфортнае жыццё ў Мінску, але не адчувае сябе шчаслівым і марыць аб вяртанні да былой жонкі. Адзінокі Валодзін атрымлівае шанс закласці сям'ю, але канчаткова вырашае: «я са сваёй шкарлупкі ў ваш свет не вылезу, надта добра ён мне знаёмы!..» [Федарэнка 2012, 238].

У сваім свеце жыве і Яўген Вінярскі з аповесці *Ланцуг*. Малады асістэнт хірурга не можа знайсці сабе месца і марыць аб эміграцыі. Здаецца, у вобразе героя пісьменнік сабраў усе негатыўныя рысы сучаснага чалавека: ён не любіць людзей, абыякава ставіцца да пацыентаў, супрацоўнікаў, вартасць маюць для яго толькі грошы. Стаўшы перад выбарам, герой не сумняваецца і падрабязна плануе крадзеж даляраў хірурга Івана Стэльмаха. Ды раптам пасля зробленага злачынства з адмоўным героем адбываюцца перамены: «у ім загаварыла душа, пачаліся цяжкія пакуты, разладзілася псіхіка» [Бельскі, online]. Пісьменнік па-мастацку перадае зрухі душы Яўгена Вінярскага, але «невыпадкова ж яму спатрэбілася меладраматычнае кола падзей – тая ж перадача па ланцугу грошай, каб неяк выйсці на перавыхаванне хірурга Вінярскага» [Козіч 2001,1042]. А. Федарэнка хоча пераканаць чытача ў тым, што яго герой стаў іншым чалавекам: «Ён ужо даўно выкінуў з галавы мары пра замежжа, грошы больш не копіць, днямі прападае ў клініцы» [Федарэнка 2012, 65]. Аднак на самай справе ў героя змяніліся, відаць, толькі некаторыя прыярытэты, бо ў адносінах да пацыентаў ён застаўся тым жа абыякавым і строгім.

А. Федарэнка, як большасць творцаў з вёсак, ці невялікіх гарадкоў, глыбей, чым гарадскія пісьменнікі, звязаны з прыродай. Гэта ў пэўнай ступені ўплывае на яго творчасць. Шчасце вяскоўца ў гарадской прасторы, на думку А. Федарэнкі, немагчымае. І таму чалавек павінен шукаць яго на ўлонні прыроды, у сустрэчах са знаёмымі з дзяцінства краявідамі і людзьмі. Такія высновы не новыя, бо беларускія пісьменнікі розных эпох менавіта ў еднасці з жывой прыродай бачылі крыніцу душэўна-духоўнага развіцця чалавека. Аднак А. Федарэнка не канцэнтруецца на тонкім увасабленні прыгажосці наваколля, раскрыцці духоўнага адзінства чалавека і прыроды. Ён засяроджваецца на паказе працэсу працяглага крызісу нашага часу, выкліканага м. інш. трансфармацыяй сацыяльна-эканамічнай сферы. Пісьменнік заўважае, што арыентацыя на паскораны статусны рух абумовіла характар сучасніка: расчараванага, замкнёнага, самотнага, няўстойлівага.

Да другой групы герояў аповесцяў А. Федарэнкі належаць жыхары вёсак, што аказваюцца яшчэ больш адзінокімі, разгубленымі, чым гараджане. У аповесці *Дзікі Луг* пісьменнік «працягвае пісаць гісторыю „вясковай”

Беларусі, тлумачыць прычыны многіх сённяшніх праблем, зазіраючы адначасова і ў мінулае, і ў будучыню» [Козіч 2001, 1057]. Аповесць можна падзяліць на две часткі. Спачатку А. Федарэнка вядзе чытача ў мінулае, паказвае жыхараў вёскі, якія штогод ездзяць на касьбу ва ўрочышча Дзікі Луг. У другой частцы на герояў глядзіць пісьменнік з шасцігадовай дыстанцыі часу.

Многія даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што Дзікі Луг нагадвае зямны рай, у якім чалавек, падпарадкаваўшыся прыродзе, становіцца лепшым. Пераступіўшы мяжу гэтага Эдэму, героі самі сябе разбураюць, становяцца ахвярамі – «толькі не соцыума і цывілізацыйнага працэсу, а бяспамяцтва і бязвер'я» [Макарэвіч, online]. Дакладна выказалася на гэту тэму Ірына Шатыронак:

> Дзікі Луг – гэта натуральны свет Куленіча, Пятра, Грыгора, дзеда Мікалая і іншых аднавяскоўцаў. У гэтых прыгожых месцах яны вяртаюцца да саміх сябе, да сваіх вытокаў. Тут на прасторах Дзікага Лугу пануе гармонія прыроды і чалавека, а па-за імі – ганебная гнюснасць і нізкія пачуцці. За межамі гэтага лугу чалавека не чакае нічога добрагага: адны страты, трагедыі, смерці, п'янства, канчатковая дэградацыя [Шатыронак 2012, 99].

Пісьменнік уводзіць сваіх герояў у гарманічную прастору свету прыроды. Яны цешацца наваколлем, супольнай працай, адпачынкам пасля яе, але не становяцца іншымі. На ўлонні прыроды не забываюцца «вясковыя» праблемы і канфлікты, аб чым сведчыць, напрыклад, стаўленне вяскоўцаў да Грыгора, адсядзеўшага «ў турме за бойку год і паўтара месяца» [Федарэнка 2012, 198]. Сярод аднавяскоўцаў няма еднасці нават тады, калі яны збіраюцца ля вогнішча і пачынаюць есці з аднаго вядра юшку:

> Увогуле, Грыгора не заўважаюць, не звяртаюцца, не гавораць з ім, як бы і няма яго.
> Паеў трошкі, голад спатоліў і маўчком падаўся да свайго шалашыка. Хоць бы хто паклікаў яго, папрасіў застацца. Так і ляжыць недзе адзін, у цемры, з камарамі, забыты-пакінуты… [Федарэнка 2012, 204].

Адна толькі Махнавачка (жонка Куленіча) «неўпрыкмет узяла недапітую бутэльку» [Федарэнка 2012, 204] і занесла яе хлопцу. Варта адзначыць, што на паводзіны гераіні не ўплывае ніякая «магія» Дзікага Лугу, бо і ў другой частцы твора яна «ратуе» Грыгора, не дапускаючы яго да бойкі з гараджанінам.

А. Федарэнка ўсведамляе сабе, што дэградацыя вёскі – вынік змен у менталітэце селяніна: «пакаленне Пятра было апошнім пакаленнем, звязаным з зямлёй; яны ведалі, што апошнія, што на іх усё скончыцца, дзеці іхнія

ўжо не выберуць іхняй долі, ды ніхто і не хацеў, каб яны яе такую выбралі» [Федарэнка 2012, 211]. Ахвярай гэтай перамены стаў найперш Пятро, званы Кветкай. Герой хоча «ездзіць далёка на цягніку, глядзець новыя мясціны, знаёміцца з рознымі цікавымі людзьмі» [Федарэнка 2012, 200], але не рашаецца здзейсніць гэтай сваёй мары. Прыйшоўшы з арміі, ён жэніцца на непрыгожай, старэйшай за яго на пяць гадоў Валі. Узнікае пытанне: чаму герой робіць менавіта такі выбар? А. Федарэнка абвінавачвае Валю, што «яго на сабе сілком жаніла» [Федарэнка 2012, 200]. Нешчаслівае сямейнае жыццё, безумоўна, адна, але ж не галоўная прычына п'янства, а канчаткова і смерці Пятра. На нашу думку, героя губіць яго абыякавасць да зямлі («гаспадаркі ён не любіў» [Федарэнка 2012, 211]) і нерашучасць у тым, каб змяніць свой лёс:

> Пятро пакрысе ператвараўся ў ціхага, скончанага п'яніцу. (…)
> Ён даўно закінуў мару пра машыніста, ужо не праводзіць з зайздрасцю вачыма хуткасныя цягнікі (…) Не расказвае ён ужо і пра свой Узбекістан (дзе служыў у войску – А.А.) [Федарэнка 2012, 211].

Пісьменнік звяртае ўвагу і на трагічны лёс сям'і Кулінічаў, якія адступіліся ад адвечных законаў вёскі. Яны пасадзілі ля хаты каліну, адкрыта цешыліся сваім шчасцем, залішне любілі адзінага сына. Пасля страты дзіцяці бацькам патрэбны былі разуменне і спагада, але яны не знайшлі іх у аднавяскоўцаў.

Адносіны да прыроды, бацькоўскай зямлі, спрадвечных каштоўнасцей і традыцый уплываюць на жыццё герояў аповесці *Ціша* – братоў Дваракаў. Прырода – самая галоўная каштоўнасць у жыцці Марака Дворака, але яго прывязанасць да зямлі меншая, чым прага адкрыцця прыгожасці свету. Герой выбірае жыццё вечнага падарожніка і толькі раз у год наведвае жонку і сына.

Стэфан Дворак працуе вартаўніком у аэрапорце і адначасова вядзе гаспадарку. Ён не заўважае хараства прыроды, не разумее яе: выкарыстоўвае самыя жахлівыя сродкі для барацьбы са «шкоднікамі»: падпальвае суседскага пеўня, што ўвайшоў на панадворак, хоча зрабіць засаду на бабра, што корміцца яго малінамі.

Зусім іншае стаўленне да прыроды ў Стаха Дворака, выбраўшага гарадское жыццё. Звяртае ўвагу яго незвычайная любасць да сучкі Цішы, якую ён лічыць аднасямейнікам. Сабака не толькі спіць на канапцы, але і есць з адной міскі з людзьмі: «Яна лезла мордачкай ва ўсе міскі, да якіх магла дацягнуцца, ніхто яе не гыркаў, ёй дазвалялася за сталом тое, што і людзям» [Федарэнка 2014, 38]. Нетрадыцыйная для селяніна трактоўка жывёлы, сведчыць аб пераацэнцы каштоўнасцей. І сапраўды, здаецца, Стах Дворак усе свае пачуцці пералівае на Цішу, людзі, нават самыя блізкія – у яго на другім месцы.

Як вядома, «прырода істотна ўздзейнічае на фізіялагічную і псіхалагічную аснову чалавека, фарміруе гнуткія пачуцці, якія ў сваю чаргу абумоўліваюць праяўленне гуманнасці і справядлівасці. Яна выхоўвае высокія маральныя і эстэтычныя ўласцівасці» [Харошка, online]. Відаць, розныя адносіны да прыроды ўплываюць і на стаўленне братоў Дворакаў да сябе саміх. Яны не разумеюць, не любяць адзін аднаго і пазбягаюць кантактаў.

Некаторыя даследчыкі лічаць А. Федарэнку «змрочным, нават дэпрэсіўным пісьменнікам» [Верціхоўская 2013, 5]. Магчыма, гэта высновa і спрэчная, аднак у аповесцях, змешчаных у кнігах *Ланцуг* і *Ціша*, пісьменнік сапраўды вельмі ж песімістычны. Нават звязаныя з зямлёй героі аповесці *Дзядзька Адольф* – браты Талян і Лёнік не знаходзяць шчасця ў жыцці. Здаецца, добрае разуменне прыроды перашкаджае ім добра разумець другога чалавека: Талян разводзіцца з жонкай і вяртаецца на родны хутар, а пачуццё адзіноты стараецца прыглушыць званкамі да свайго дзядзькі. Яшчэ горшы лёс наканаваны Лёніку, які нагадвае дзівака, што саромеецца і баіцца людзей, а найлепш адчувае сябе адзін на адзін з прыродай: у канцы аповесці брат знаходзіць яго цела.

Любоў да роднай зямлі і туга па ёй вызначаюць паводзіны салдата Алёшы Ласіцы (*Салдат*). Служба ў войску па-за межамі Беларусі для маладога хлопца аказваецца трагедыяй. Ён марыць аб вяртанні дахаты і пачаткова ратуе сябе ўспамінамі пра родную вёску, бацькоў, сястру, сяброўку Ніну, але ж урэшце рэалізуе абдуманы тысячу разоў план уцёкаў.

А. Федарэнка глыбока перадае псіхічны стан Алёшы Ласіцы, зламаўшага падчас уцёкаў нагу. Спачатку ён гатовы зрабіць усё, каб толькі дасягнуць вызначанай мэты:

> Цяпер толькі звярыны адчай штурхаў яго ў спіну, гнаў уперад, патрабаваў хоць якога дзеяння… Дачакацца і спыніць машыну? Як страляць па колах? І што потым, калі машына спыніцца? Паўзці да яе? Так, паўзці! Не ляжаць жа пад хвояю, не чакаць, пакуль прыедуць і абложаць, бы ваўка!… [Федарэнка 2012, 136].

Потым, калі герой знаходзіць транспарт, увесь план падаецца яму кашмарам і вар'яцтвам: «На што ён спадзяваўся?! Ну, а калі нават не нага?! Ах, як бязглузда, непатрэбна ўсё!..» [Федарэнка 2012, 138].

Пісьменнік задумваецца над лёсам салдат, што вымушаны пакідаць Радзіму ў мірны час. І прыходзіць да высновы, што «чалавек сам не ведае, што робіць, на ўсё ідзе, нават на забойства, каб толькі радзіму паглядзець» [Федарэнка 2012, 152]. Аляксей Лісіцкі ўсведамляе сабе, што яго туга – хвароба, якую трэба лячыць, але ён разумее, што нават, калі здасцца, яму ніхто не паможа: проста замкнуць у псіхушку. «Пакрыўджаны ў лепшых

сваіх памкненнях, перажыўшы моцнае прыніжэнне, несправядлівасць, нават безвыходнасць, Аляксей выбірае свабоду жыць па сваіх маральных прынцыпах. А паколькі гэта неажыццявіма, то ён выбірае небыццё» [Козіч 2001, 1045].

Відавочна, што А. Федарэнка з песімізмам глядзіць і на жыхароў вёскі. У творах, прысвечаных ім, пісьменнік паказвае, што і ў сучаснага вяскоўца ёсць свае балючыя, часам невырашальныя праблемы.

Усе рысы федарэнкаўскіх герояў сканцэнтраваны ў вобразе галоўнага героя аповесці *Пра аднаго пісьменніка*[2] (1994, 2006). Мікола Пятровіч, імя і прозвішча якога будзе названа толькі ў канцы першай часткі твора, з'яўляецца пісьменнікам, што пакідае гарадское жыццё і падаецца ў родныя пенаты. А. Федарэнка увесь час трымае чытача ў цікаўнасці, нават напружанні, паступова раскрываючы свет свайго героя. Спачатку аб героі ведаем зусім няшмат: гэта пісьменнік, якога прыгнала ў родную вёску, «як старога сабаку, што чуе смерць і сыходзіць з воч людскіх» [Федарэнка 2012, 72]. Праўда, адразу пісьменнік падкрэслівае, што вёска за некалькі гадоў змяніла сваё аблічча, бо засялілася дачнікамі. Аднак нават у гэтай новай рэальнасці федарэнкаўскаму герою ўдаецца знайсці тое, што прыносіць яму ратунак. Сяброўка дзяцінства, былая каханая, удава Ліда дапамагае герою зразумець, што інфаркт не з'яўляецца смяротным прысудам.

Мікола Пятровіч – тыповы гараджанін: «жыў, ні пра што не дбаючы, не хварэў, на добрай чыстай працы, дажыў амаль да пенсіі» [Федарэнка 2012, 75]. Намнога цікавейшы персанаж паўстае перад чытачом у вобразе пісьменніка і рэдактара, для якога літаратура з'яўляецца ўсім. Ён сам характарызуе сябе як сумленага рамесніка і добрага рэдактара, але бачыць і пэўныя свае хібы: «Я мог перапісваць аповесць ці апавяданне па чатырнаццаць разоў і, камбінуючы, шляхам спробаў і памылак, чыста матэматычна дабіваўся таго ж, чаго іншыя дабіваліся на адным дыханні, у хвіліны натхнення» [Федарэнка 2012, 83]. Творчая біяграфія героя не ўражвае – ён аўтар толькі дзесяці аркушаў *Выбранага*. Ён сумленна прызнаецца: «стараўся кляпаць у мастацкіх вобразах тое, што не магло быць вечна, верыў у тое, у што нельга было верыць: у сацыялізм, у калгасы, у грамадства вышэйшай справядлівасці, у партыю камуністаў» [Федарэнка 2012, 84].

А. Федарэнка закранае ў аповесці пытанні псіхалогіі творчасці, раскрывае погляды мастака слова, што не ўяўляе сабе жыцця без літаратуры. Праўда, у нейкі момант Мікола Пятровіч прыходзіць да высновы: «Я не столькі

[2] У пятым нумары часопіса «Полымя» была надрукавана аповесць *Повесць*, якую пазней А. Федарэнка пераапрацаваў і выдаў ў кнізе *Ланцуг* пад назвай *Пра аднаго пісьменніка*.

жыў літаратураю, колькі прывык жыць ёю. (…) Прывыкну і я жыць без літаратуры» [Федарэнка 2012, 91]. Аднак патрэба мастацкай працы аказалася настолькі моцнай, што пасля вартання ў Мінск амаль адразу ўся ўвага героя канцэнтравалася на творчым працэсе. Паздаравеўшы, адпачыўшы, набраўшыся сіл у вёсцы, ён вырашыў рэалізаваць даўнюю задуму і выдаць напісаную ім раней *Повесьць*, што доўгі час праляжала ў шуфлядзе.

Герой аповесці *З кошыкам, або гісторыя ненапісанай аповесці* (2004) – таксама пісьменнік. Першаасабовы наратар-аўтар дзеліцца з чытачом развагамі, выкліканымі нечаканым адкрыццём: «Я бачыў перад сабой уласную будучую аповесць, толькі чужым прозвішчам падпісаную. Ды яшчэ выкананне было лепшае, чым магло б быць у мяне» [Федарэнка 2012, 164]. А. Федарэнка глыбока раскрывае думкі пісьменніка, задума якога была рэалізавана іншым аўтарам: «З усіх бакоў, па ўсіх пунктах я бачыў сябе абкрадзеным. Не матэрыяльна, вядома, не ў сэнсе плагіяту, не – проста здавалася, у мяне адабралі тую дзіцячую „радасць”, з якой так прыемна насіцца і дзякуючы якой крыху цікавей жыць на свеце» [Федарэнка 2012, 165]. Герою-пісьменніку, відавочна, крыўдна, што не паспеў пераліць свае думкі на паперу, што аповесць аб грыбах і грыбніках ужо напісана, але ж ён – мастак слова. Прачытаўшы твор невядомага яму Барыса Васілеўскага, герой прыходзіць да высновы, што яму ёсць аб чым яшчэ сказаць, бо грыбная тэма – невычарпальная.

Аповесць *З кошыкам…* – гэта арыгінальны паводле формы і зместу твор, а ў асобе героя выразна бачыцца асоба самога А. Федарэнкі. Пісьменнік вяртаецца да ўласных успамінаў, падарожнічае ў прасторы і часе. «Грыбная» тэма развіваецца ў расказ аб яго роднай Мазыршчыне, дзяцінстве, сям’і, пісьменніцкай працы.

Такім чынам, можна сцвердзіць, што страта адвечных маральна-этычных арыенціраў, духоўны крызіс чалавека, што шукае новыя фундаментальныя каштоўнасці, з’яўляецца імпульсам для творчасці А. Федарэнкі. Са сваімі героямі пісьменнік абыходзіцца нетрадыцыйна жорстка. Амаль усе героі яго аповесцяў – нешчаслівыя людзі. У іх ёсць і свае каштоўнасці, і пэўныя хібы, але менавіта іх незадавальненне жыццём вызначае пазіцыю аўтара. Ён нібы своеасабліва карае сваіх герояў за тое, што не ўмеюць даражыць тым, што ў іх ёсць. З групы нешчасліўцаў вылучаюцца толькі героі-пісьменнікі.

## Бібліяграфія


Alejnìk Lada. *Tvorčy roskvìt Andrèâ Fedarènkì. Pìs'mennìku – 50!* (online) https://lit-bel.org/news/Tvorchi-roskvt-Andreya-Fedarenk-Psymennku-4633/(dostup 10.05.2018) [Алейнік Лада. *Творчы росквіт Андрэя Федарэнкі. Пісьменніку – 50!* (online) https://lit-bel.org/news/Tvorchi-roskvt-Andreya-Fedarenk-Psymennku-4633/ (доступ 10.05.2018)].

Bel′skì Ales′ 1997. *Sučasnaâ belaruskaâ lìtaratura. Stanaŭlenne ì razvìccë tvorčyh ìndyvìdual'nascâŭ (80–90-yâ gg.). Vučèbna-metadyčny dapamožnìk dlâ nastaŭnìkaŭ.* Mìnsk: Narodnaâ asveta. (online) https://presentdaymova.files.wordpress.com/2015/ 11/20083-1.pdf (dostup 8.07.2018) [Бельскі Алесь 1997. *Сучасная беларуская літаратура. Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80–90-ыя гг.). Вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў.* Мінск: Народная асвета. (online) https://presentdaymova.files.wordpress.com/2015/11/20083-1.pdf (доступ 8. 07.2018)].

Fedarènka Andrèj. 2012. *Lancug. Apovescì*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura [Федарэнка Андрэй. 2012. *Ланцуг. Аповесці*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Fedarènka Andrèj. 2013. *«Lûblû samo slova – apovesc'…»*. «Knìganoša» № 21. (online) https://zbsb.org/upload/iblock/139/139dcd03b235f7506ba6ee00b8671d43.pdf (dostup 25.05.2018) [Федарэнка Андрэй. 2013. *«Люблю само слова – аповесць…»*. «Кніганоша» № 21. (online) https://zbsb.org/upload/iblock/139/139dcd03b235f7506 ba6ee00b8671d43.pdf (доступ 25.05.2018)].

Fedarènka Andrèj. 2014. *Cìša. Apovescì*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura [Федарэнка Андрэй. 2014. *Ціша. Аповесці*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Haroška Genadzìj. *Prablema «čalavek ì pryroda» ŭ belaruskaj paèzìì drugoj palavìny XX stagoddzâ*. (online) https://lib.vsu.by/xmlui/bitstream/handle/123456789/7282/ horoško.pdf?sequence=1&Isallowed=Y (dostup 13.06.2018) [Харошка Генадзій. *Праблема «чалавек і прырода» ў беларускай паэзіі другой палавіны XX стагоддзя*. (online) https://lib.vsu.by/xmlui/bitstream/handle/123456789/7282/хорошко.pdf?sequence=1&isAllowed=y (доступ 13.06.2018)].

Kìslìcyna Ganna. 2012. *Fìlasofìâ ìsnavannâ ŭ apavâdannâh A. Fedarènkì*. «Vescì Nacyânal′naj akadèmìì navuk Belarusì» № 3: 91–94 [Кісліцына Ганна. 2012. *Філасофія існавання ў апавяданнях А. Федарэнкі.* «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» № 3: 91–94].

Košman Pavel *Nacyânal'ny vobraz svetu ŭ aŭtarskaj versìì Andrèâ Fedarènkì*. (online)
http://dspace.mspu.by/bitstream/123456789/2844/1/%D0%9A%D0%BE%D1%88%D0%BC%D0%B0%D0%BD%2C%20%D0%9F.%20%D0%A0.%20%D0%9D%D0%B0%D1%86%D1%8B%D1%8F%D0%BD%D0%B0%D0%BB%D1%8C%D0%BD%D1%8B%20%D0%B2%D0%BE%D0%B1%D1%80%D0%B0%D0%B7%20%D1%81%D0%B2%D0%B5%D1%82%D1%83.pdf (dostup 9.07.2018) [Кошман Павел *Нацыянальны вобраз свету ў аўтарскай версіі Андрэя Федарэнкі*. (online) http://dspace.mspu.by/bitstream/123456789/2844/1/%D0%9A%D0%BE%D1%88%D0%BC%D0%B0%D0%BD%2C%20%D0%9F.%20%D0%A0.%20%D0%9D%D0%B0%D1%86%D1%8B%D1%8F%D0%BD%D0%B0%D0%BB%D1%8C%D0%BD%D1%8B%20%D0%B2%D0%BE%D0%B1%D1%80%D0%B0%D0%B7%20%D1%81%D0%B2%D0%B5%D1%82%D1%83.pdf (доступ 9.07.2018)].

Kozìč Vol′ga 2015. *Andrèj Fedarènka*. U: *Gìstoryâ belaruskaj lìtaratury HH stagoddzâ: U 4-oh tamah*. Pad navuk. rèd. Gnìlamëdava U.V., Laŭšuka S.S. t. 4. kn. 3. Mìnsk: Belaruskaâ navuka: 1038–1061 [Козіч Вольга 2015. *Андрэй Федарэнка*. У: *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4-ох тамах*. Пад навук. рэд. Гніламёдава У.В., Лаўшука С.С. т. 4. кн. 3. Мінск: Беларуская навука: 1038–1061].

Kyz′mič Marina. *Što trèba belaruskamu pìs'mennìku, kab stac' vâdomym pry žyccì?* (online) https://www.sb.by/articles/shto-treba-belaruskamu-p-smenn-ku-kab-stats-vyado

mym-pry-zhytsts-.html (dostup 23.06.2018) [Кузьмич Марина. *Што трэба беларускаму пісьменніку, каб стаць вядомым пры жыцці?* (online) https://www.sb.by/articles/shto-treba-belaruskamu-p-smenn-ku-kab-stats-vyadomym-pry-zhytsts-.html (доступ 23.06.2018)].

Makarèvìč Ìna. *Sacyâl'nyâì maral'na-filasofskìâ prablemy ŭ sučasnaj proze (na prykladze apovescì A. Fedarènkì «Dzìkì lug»)*. (online) http://www.academy. edu.by/files/e%20konf%20bel%20 2016/Makarevich*%20bel.pdf* (dostup 13.06.2018). [Макарэвіч Іна *Сацыяльныя і маральна-філасофскія праблемы ў сучаснай прозе (на прыкладзе аповесці А. Федарэнкі «Дзікі луг»).* (online) *http://www.academy. edu.by/files/e%20konf%20bel%202016/Makarevich%20bel.pdf* (доступ 13.06.2018)].

Naumovìč Uladzìmìr. 2007. *Belaruskaâ apovesc' XX st.: ìdèjna-èstètyčnaâ èvalûcyâ*. «Vesnìk BDU» № 1: 11. (online) http://elib.bsu.by/bitstream/123456789/13482/ 1/navumovich%208-12.pdf (dostup 13.06.2018) [Наумовіч Уладзімір. 2007. *Беларуская аповесць XX ст.: ідэйна-эстэтычная эвалюцыя.* «Веснік БДУ» № 1: 11. (online) http://elib.bsu.by/ bitstream/123456789/13482/1/ navumovich%208-12.pdf (доступ 13.06.2018)].

Vercìhoŭskaâ Maryâ 2013. *Ad «Pelì» da «Dzìkaga Lugu».* «Lìtaratura ìmastactva» № 28: 5 [Верціхоўская Марыя 2013. *Ад «Пелі» да «Дзікага Лугу».* «Літаратура і мастацтва» № 28: 5].

## Summary


### The image of the protagonist in Andrey Fiedarenko's stories (based on the books *The Chain* and *Silence*)

Andrey Fiedarenka (born in 1959) – author of the books: *History of the disease* (1989), *Misery* (1994), *Afghan casket* (2002), *No one's* (2009), *The Chain* (2012), *Silence* (2014) and others, winner of many awards, including Jerzy Giedroyc Literary Award. The writer is considered a classic of Belarusian literature. In his artistic work, three basic types of heroes can be distinguished: inhabitants of villages, city dwellers and writers. The presentation of often difficult family relations, differences in characters and life priorities of the heroes become for A. Fiedarenka a pretext for deliberations on the subject of contemporary man's life, his attitude towards people and nature. In his stories, the writer presents primarily people disappointed with life, lonely, seeking the sense of existence in contact with nature. Only hero-writers can be distinguished from the gallery of poor wretches.


**Key words**: story, psychologism, city, village, writer

Kontakt z Autorką:
a.alsztyniuk@o2.pl